**СМАЛЯВІЦКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

вул. Савецкая, 125
222201, г. Смалявічы
тэл. (801776) 55 291
факс (801776) 27 633

**СМОЛЕВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

ул. Советская, 125
222201, г. Смолевичи
тел. (801776) 55 291
факс (801776) 27 633

13.01.2023 № 3-6/1244-Пг ; 3-6/1285-Пг

на № ________________

Аб разглядзе зваротаў

Смалявіцкі раённы выканаўчы камітэт разгледзеў Вашы электронныя звароты па пытанні будаўніцтва аўтастанцыі ў раёне прып. пункта «Зарэчнае» у г. Смалявічы і, у межах сваёй кампетэнцыі, паведамляе.

Заказчыкам па будаўніцтве аб'екта «Будаўніцтва аўтастанцыі ў г. Смалявічы», у складзе якога мяркуецца будаўніцтва будынка аўтастанцыі ў раёне прыпыначнага пункта «Зарэчнае» і рэканструкцыя вул. 50 гадоў Кастрычніка ў г. Смалявічы, выступае ДП «УКБ Смалявіцкага раёна».

З улікам афармлення матэрыялаў папярэдняга ўзгаднення зямельных участкаў і адсутнасці крыніцы фінансавання праектаванне аб'екта ў 2021 годзе было прыпынена.

У 2022 годзе вышэйназваны аб'ект быў уключаны ў інвестыцыйную праграму Смалявіцкага раёна, аднак не было выдзелена фінансаванне для завяршэння работ па праектаванні і правядзенні экспертызы праектнай дакументацыі.

Згодна з дзейным генеральным планам горада-спадарожніка г. Мінска Смалявічы будынак аўтастанцыі нельга размясціць у вышэйназваным раёне горада.

Праектаванне аб'екта «Будаўніцтва аўтастанцыі у г. Смалявічы» будзе адноўлена пасля зацвярджэння карэкціроўкі генеральнага плана горада-спадарожніка г. Мінска Смалявічы і пры ўмове забеспячэння фінансаваннем.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18.07.2011 № 300-З «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асобаў» Вы маеце права абскардзіць дадзены адказ у Мінскі абласны выканаўчы камітэт (г. Мінск, вул. Энгельса, 4).

Намеснік старшыні М.Р.Парамонаў

Бажэжа (8 01776) 5 51 38

0062404